5. Распоряжение ГКБ и местной комендатуры № 352 г. Минска от 26 сентября 1941 г. // НАРБ. – Фонд 391. – Оп. 1. – Д. 13. – Л. 1–2.
6. Выписка их особых распоряжений об обращении с военнопленными // НАРБ. – Фонд 391. – Оп. 1. – Д. 144. – Л. 34–35 об.
7. Kriegsgefangenen Monatsmeldung nach dem Stand 1 jeden Monats // НАРБ. – Фонд 393. – Оп. 1. – Д. 417. – Л. 1.
8. Донесение областному комиссару в Вилейке о питании русских военнопленных от 08.12.1941 г. // Государственный архив Минской области. – Фонд. 4232. – Оп. 1. – Д. 10. – Л. 64.
9. Перечень предприятий, на которых использовали труд военнопленных // Государственный архив Могилевской области. – Фонд 259. – Оп. 1. – Д. 7. – Л. 146.
10. Инструкция по охране советских военнопленных в составе рабочих команд // Государственный архив Витебской области (ГАВО).– Фонд 2073. – Оп. 1. – Д. . – Л. .
11. Образец удостоверения о назначении военнопленного на сельскохозяйственные работы // ГАВО. – Фонд 2848. – Оп. 1. – Д. 353 . – Л. 6.
12. Verpflegung der sowjetischen Kriegsgefangenen// НАРБ. – Фонд 379. – Оп. 3. – Д. 1. – Л. 46– 48.
13. Kriegsgefangenen-Nebenlager 4 September 1942 // НАРБ. – Фонд 378. – Оп. 1. – Д. 171. – Л. 24–25.

**Нікалаева І.У.**

## ДАКУМЕНТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АРХІЎНАГА ФОНДУ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ЖАНЧЫН НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ 1941–1944 гг.

Прынцыповыя змены, якія намеціліся апошнім часам у асэнсаванні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, паставілі у цэнтр гістарычных даследаванняў не столькі пытанні ваеннай гісторыі, колькі гісторыі “чалавека на вайне”. Гэта абумовіла неабходнасць асэнсавання гісторыі мінулай вайны з пазіцыі вопыту разнастайных сацыяльна-дэмаграфічных груп, у тым ліку жанчын, і вызначэння іх спецыфічнага становішча ў сістэме грамадскіх адносін ваеннага перыяду.

Нягледзячы на пэўны інтарэс айчынных даследчыкаў да жаночай гісторыі вайны, на сёняшні дзень значнае прырашчэнне ведаў пра становішча жанчын на акупаванай тэрыторыі Беларусі адбываецца, галоўным чынам, за кошт матэрыялаў сабраных метадамі вуснай гісторыі, якія патрабуюць ад прафесійнай гістарыяграфіі іх далейшага скрупулёзнага аналізу ў комплексе з іншымі крыніцамі. У гэтай сувязі каштоўнай крыніцазнаўчай базай з’яўляюцца дакументы нацыянальнага архіўнага фонду, пераважная большасць якіх уяўляе сабой беларуска- і рускамоўныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ) і дзяржаўных абласных архівах у рукапіснай, друкаванай і мікрафільмавай формах.

Дадзеныя архіўныя крыніцы адрозніваюцца тэматычнай разнастайнасцю. Сярод іх вылучаюцца, па-першае, дакументы, якія характарызуюць сацыяльна-эканамічныя, культурныя, ідэалагічныя аспекты нацысцкай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, дзейнасць германскіх улад у адносінах да мясцовага жаночага насельніцтва; па-другое, матэрыялы, якія раскрываюць масава-палітычную работу партыйных і камсамольскіх органаў і арганізацый сярод жаночага насельніцтва ў тыле ворага, а таксама адлюстроўваюць удзел жанчын у антынацысцкім супраціўленні.

Першы комплекс крыніц па паходжанні можна падзяліць на дзве групы. У першую чаргу гэта справаводная дакументацыя органаў акупацыйнага кіравання: генеральных, акруговых і гарадскіх камісарыятаў, гарадскіх, раённых і валасных упраўленняў. Карыстаючыся класіфікацыяй, прапанаванай І.Э Яленскай [1], тут можна вылучыць наступныя віды крыніц: арганізацыйна-распараджальныя дакументы (загады, распараджэнні, прадпісанні, цыркуляры акупацыйных улад у дачыненні да жаночага насельніцтва); справаздачная дакументацыя (даклады, справаздачы акупацыйнай адміністрацыі, дакументы выніковага характару, якія ўтрымліваюць прамыя і ўскосныя звесткі пра жаночае насельніцтва); справачна-інфармацыйная дакументацыя (статыстычныя звесткі аб працаздольнасці, занятасці, прафесійным складзе жаночага насельніцтва, паведамленні пра ўдзел жанчын у прымусовых работах, даведкі) Аналіз гэтай катэгорыі архіўных крыніц, якія ўтрымліваюцца пераважна ў фондах дзяржаўных абласных архіваў, дае магчымасць высветліць метады і пры-



Репозиторий ВГУ

ёмы прыцягнення жанчын да прымусовай працы, асноўныя накірункі выкарыстання жаночай працоўнай сілы ў інтарэсах германскай ваеннай эканомікі, ацаніць дзейнасць мясцовай акупацыйнай улады ў дачыненні да жаночага насельніцтва ў сацыяльнай сферы, ахарактарызаваць ступень харчовага і таварнага забеспячэння жанчын, становішча з аказаннем ім медыцынскай дапамогі ва ўмовах акупацыйнага рэжыму.

Сярод адпаведных матэрыялаў, якія захоўваюцца ў НАРБ, найбольшую каштоўнасць уяўляе 370 фонд, у якім сабраны дакументы, што характарызуюць палітыку германскіх улад у адносінах да жаночага насельніцтва ў межах генеральнай акругі Беларусь. Яны прадстаўлены загадамі і інструкцыямі Рэйхсміністэрства па ўсходніх занятых абласцях, Рэйхскамісарыята "Остланд", якія датычацца мясцовага жаночага насельніцтва. Справы фонда ўтрымліваюць перапіску Рэйхскамісарыята "Остланд" з генеральным камісарыятам Беларусі па пытаннях аплаты працы жанчын з ліку мясцовага насельніцтва, умоў працы цяжарных і г.д.

Акрамя таго, сярод крыніц, якія захоўваюцца ў НАРБ, нам бачацца каштоўнымі арыгінальныя дакументы, што адлюстроўваюць дзейнасць германскіх акупацыйных улад па стварэнні калабарацыйных жаночых арганізацый. Так, цікавасць уяўляе статут Усебеларускага жаночага камітэта, які ўтрымліваецца ў 384 фондзе – "Цэнтральнае ўпраўленне беларускай самапомачы". У другім вопісе 385 фонду – "Кіруючы штаб Саюза беларускай моладзі" – зберагаюцца статут і план работы "Аб'яднання Беларускіх Жанчын", матэрыял пра асноўныя напрамкі дзейнасці аб'яднання, яго непарыўную сувязь з палітыкай германскіх акупацыйных улад.

Важнае значэнне для раскрыцця тэмы становішча жанчын на акупаванай тэрыторыі Беларусі маюць таксама трафейныя варожыя дакументы, змешчаныя ў фондзе Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ (ф. 4683). Перш за ўсё тут звяртае на сябе ўвагу інфармацыя пра аддзелы па рабоце сярод жанчын у структуры нямецкіх акупацыйных органаў, метады і маштабы выкарыстання нацыстамі працы жаночага насельніцтва Беларусі.

У асобную групу трэба вылучыць дакументы падпольных партыйных і камсамольскіх органаў і арганізацый, БШПР, антыфашысцкіх арганізацый, якія ўтрымліваюцца ў адпаведных фондах НАРБ і асвятляюць сацыяльна-эканамічную і рэпрэсіўную палітыку акупацыйных улад у адносінах да жаночага насельніцтва. Галоўным чынам гэта матэрыялы, складзеныя на падставе аператыўных даных савецкіх груп, органаў НКУС, партызан і падпольшчыкаў, якія знаходзіліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Яны наглядна сведчаць пра метады нацысцкай акупацыйнай палітыкі ў дачыненні да жаночага насельніцтва, утрымліваюць багаты факталагічны матэрыял пра злачынствы нацыстаў у адносінах да беларускіх жанчын, які практычна адсутнічае ў крыніцах першай групы.

Другі тэматычны блок крыніц складаюць дакументы савецкага паходжання па гісторыі антынацысцкай барацьбы ў Беларусі, сярод якіх прысутнічаюць матэрыялы, якія садзейнічаюць раскрыццю пытанняў пра ўдзел жанчын у супраціўленні акупацыйнаму рэжыму.

У адзначаным корпусе архіўнага матэрыялу важнае месца належыць фонду ЦК КП(б)Б (ф. 4-п), дзе сабраны пратаколы пасяджэнняў бюро ЦК КП(б)Б перыяду вайны, пастановы, дырэктывы, указанні, распараджэнні па пытаннях падполля і партызанскага руху. Сярод крыніц названага фонду важнае месца займае статыстычная інфармацыя аб партызанскіх сілах асобных абласцей і рэспублікі ў цэлым з указаннем колькаснага складу ў іх жанчын на розных этапах барацьбы.

Удзел маладых жанчын у атынацысцкім супраціўленні найбольш поўна пададзены ў фондзе ЦК ЛКСМБ (ф. 63-п). Фонд утрымлівае пратаколы пасяджэнняў бюро ЦК ЛКСМБ за ўвесь час вайны. Асаблівую цікавасць уяўляе прынятая ім 10.10.1942 г. пастанова "Аб рабоце камсамольскіх арганізацый Беларусі сярод жаночай моладзі ў тыле праціўніка". Сярод матэрыялаў фонду звяртаюць на сябе ўвагу шэраг



Рэпазіторый ВГУ

інфармацыйна-справаздачных матэрыялаў падпольных абласных, гарадскіх і раённых камсамольскіх арганізацый аб падрыхтоўцы дзяўчат-партызанак да ўзброенай барацьбы, звесткі пра іх баявую дзейнасць.

Значная колькасць інфармацыйных і справаздачных дакументаў і матэрыялаў, якія адлюстроўваюць патрыятычную дзейнасць жанчын у рэгіёнах, арганізатарскую і палітычную работу мясцовых партыйных і камсамольскіх камітэтаў сярод гэтай катэгорыі насельніцтва, захоўваецца ў фондах падпольных абкамаў і райкамаў КП(б)Б і ЛКСМБ, сістэматызацыя якіх ажыццёўлена згодна адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу Беларусі на канец 1940 г.

У прыватнасці, у вышэй названых фондах значным патэнцыялам для даследавання гісторыі удзелу жанчын у партызанскім руху валодаюць дакладныя запіскі, паведамленні і справаздачы ўпаўнаважаных ЦК, падпольных абкамаў і райкамаў КП(б)Б і ЛКСМБ "о работе среди женщин". Нягледзячы на тое, што структура гэтых справаздач відавочна адпавядае прадпісанай зверху схеме, яны пакідаюць месца для індывідуальнага зместу і даюць некаторае ўяўленне пра праблемы, звязаныя з уключэннем значнай колькасці патрыятычна настроеных жанчын у мужчынскія баявыя падраздзяленні, а таксама дазваляюць прааналізаваць, наколькі раўнапраўе палоў у ваеннай сферы, якое дэкларавала савецкая дзяржава, адпавядала сапраўднаму становішчу ў партызанскіх фарміраваннях. Названыя архіўныя дакументы ўтрымліваюць не толькі меўшыя месца факты дыскрымінацыі па палавой прыкмеце, але і сведчаць пра пратэстныя настроі саміх партызанак па прычыне суб'ектыўных адносін да іх каманднага складу і мужчынскай большасці ў цэлым, а таксама адлюстроўваюць, як партыйнае і партызанскае кіраўніцтва вырашала праблемы, звязаныя з "недооценкой роли женщин в партизанской борьбе".

Сярод дакументаў, якія таксама знаходзяцца на захаванні ў НАРБ, важнай крыніцай даследавання пытанняў удзелу жаночага насельніцтва рэспублікі ў патрыятычным падполлі з'яўляюцца матэрыялы прадстаўленыя ў фондах падпольных груп і арганізацый. Іх вывучэнне дазваляе вызначыць прадстаўніцтва жанчын у складзе асобных арганізацый, прааналізаваць некаторыя дэмаграфічныя даныя пра падпольшчыц, прасачыць формы іх удзелу ў антыфашысцкім падпольным руху 1941–1944 гг.

Вялікую каштоўнасць уяўляюць матэрыялы фонду БШПР (ф. 3500). Пільную ўвагу выклікае змешчаная тут справаздачная статыстыка, прадстаўленая аддзелам кадраў штаба, якая характарызуе ўдзел жанчын у партызанскім руху на тэрыторыі рэспублікі: іх прадстаўніцтва ў складзе партызанскіх фарміраванняў, сувязных, агентурных разведчыкаў, колькасць загінуўшых, прапаўшых без вестак, трапіўшых у палон, расстраляных па прыгаворы партызанскіх судоў. Асаблівую цікавасць мае такі від масавых крыніц, як спісы асабовага складу партызанскіх фарміраванняў, аналіз якіх дазваляе стварыць рэпрэзентатыўную карціну жаночага складу партынскіх фарміраванняў, а таксама прасачыць далучэнне жанчын да партызанскага руху на розных этапах яго развіцця. Асобную групу крыніц, змешчаных у фондзе, складаюць "гісторыі" партызанскіх брыгад і атрадаў, у якіх асобна прадстаўлена агульная інфармацыя пра жанчын-удзельніц партызанскага руху (колькасны склад, пасады ў атрадзе, канкрэтныя прыклады дзейнасці асобных партызанак, імёны і прозвішчы жанчын і дзяўчат, прадстаўленых да ўзнагароды, і г.д.), а таксама прысутнічаюць звесткі, якія датычацца партызанскай паўсядзённасці асобных фарміраванняў і даюць унікальную магчымасць рэканструяваць жаночы партызанскі быт.

Такім чынам, пералічаныя архіўныя крыніцы, якія знаходзяцца ў даступных для даследчыкаў фондах, характарызуюцца значнай інфармацыйнай насычанасцю і іх крытычнае асэнсаванне, а магчыма і новае прачытанне, супастаўленне і параўнальны аналіз з крыніцамі асабістага паходжання дазволяць сфарміраваць цэльнае, сістэмнае, панарамнае ўспрыняцце гісторыі жанчын на акупаванай тэрыторыі Беларусі 1941–1944 гг.

1. Еленская, И.Э. Документы немецко-фашистских оккупационных органов управления и учреждений как исторический источник: (По материалам Госархива Брест. обл.) / И.Э. Еленская: Автореф. дис. …канд. ист. наук: 07.00.09 / НАН Беларуси, Ин-т истории – Минск, 1999. – 18 с.



Рэпазіторый ВДУ